

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс**
**дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №7 (23)
Сакавік 2022

## У нумары:

| | |
|---|---|
| **1 сакавіка – Міжнародны дзень барарцьбы з наркаманіяй** | **Стар. 1** |
| **Масленіца - 2022** | **Стар. 2** |
| **Дэкада прававых ведаў** | **Стар. 3** |
| **Адзіны ўрок "Аб чым звіняць званы Хатыні?"** | **Стар. 4** |
| **Адзіная інфармацыйная гадзіна** | **Стар. 5** |
| **Агульнашкольны бацькоўскі сход** | **Стар. 5** |
| **Здаровы Я – здаровая малая радзіма мая!** | **Стар. 6** |

# 1 сакавіка – Міжнародны дзень барацьбы з наркаманіяй




Праблема наркаманіі з'яўляецца адной з найбольш актуальных як для аховы здароўя, так і для ўсяго грамадства ў цэлым. Гэта абумоўлена цяжкімі медыцынскімі і сацыяльнымі наступствамі ўжывання псіхаактыўных рэчываў. Шэраг наркотыкаў здольны сфарміраваць наркаманію пасля аднаго-двух выпадкаў ужывання.

1 сакавіка вучні 5-6 класаў прынялі ўдзел у нацыянальным флэшмобе **“#Беларусь супраць наркотыкаў”**






# Масленіца - 2022




Масленіца – не толькі адно з самых чаканых і любімых у народзе святаў, але і адно з самых доўгіх. Даты масленічнага тыдня мяняюцца і залежаць ад Вялікадня. Масленіца пачынаецца за 56 дзён да хрысціянскага свята. У 2022 годзе Масленіцу святкавалі з 28 лютага па 6 сакавіка.

У рамках мерапрыемстваў шостага школьнага дня 5 сакавіка ў школе прайшло святочнае гулянне "Масленіца". Дзеці прымалі актыўны ўдзел у разнастайных конкурсах, вадзілі вясёлыя карагоды і елі самыя смачныя бліны!!!

Падрабязнасці глядзіце ў нашым фотарэпартажы.


























# Дэкада прававых ведаў




З 1 па 12 сакавіка ў рамках дэкады прававых ведаў "ВЕДАЕМ правы, РАЗУМЕЕМ абавязкі, УСВЕДАМЛЯЕМ адказнасць" для вучняў былі арганізаваны і праведзены розныя мерапрыемствы прававой тэматыкі.

11 сакавіка ў 5-6 класах прайшла класная гадзіна "Правоў без абавязкаў не бывае". Рабяты абмеркавалі асноўныя заканадаўчыя акты, якія рэгулююць захаванне правоў дзіцяці ў нашай краіне, пералічылі свае асноўныя правы, згулялі ў ролевую гульню "Юрыдычная кансультацыя" і прыйшлі да высновы аб тым, што акрамя правоў у кожнага чалавека ёсць і абавязкі, якія неабходна выконваць.






У 3 класе прайшла класная гадзіна "Падарожжа ў краіну Законію". Рабятам было цікава паўтарыць свае правы і даведацца аб сваіх абавязках. Высветлілі, што любое парушэнне правоў і невыкананне абавязкаў цягне за сабой адказнасць.








З 1 па 12 сакавіка ў школьнай бібліятэцы праходзіла тэматычная кніжная выстаўка на тэму "Я і закон". 11 сакавіка прайшла пазнавальная гутарка "Няма правоў без абавязкаў і няма абавязкаў без правоў". Пасля разважанняў рабят над дадзеным сцвярджэннем былі праведзены практыкаванні метадам "Павуціна". Падчас праведзенага мерапрыемства вучні засвоілі, што трэба не толькі ведаць свае правы, але і выконваць абавязкі, якія вынікаюць з гэтых правоў.






# Адзіны ўрок
# “Аб чым звіняці званы Хатыні?”




«О чём звонят колокола Хатыни?»

22 сакавіка 2022 года спаўнілася 79 гадоў трагедыі, якая здарылася ў вёсцы Хатынь Лагойскага раёна.

Хатынь стала сімвалам трагедыі беларускага народа, журботнай старонкай гісторыі часоў Вялікай Айчыннай вайны.

22 сакавіка для вучняў 1-6, 7-9 класаў прайшоў адзіны ўрок "Аб чым звіняць званы Хатыні?". Рабяты яшчэ раз узгадалі гісторыю той страшнай трагедыі і тое, што лёс выпаленай Хатыні паўтарылі многія вёскі Беларусі.

Урок у 1-6 класах быў накіраваны на асэнсаванне вучнямі трагедыі беларускага народа, які ў час Вялікай Айчыннай вайны пазнаў жорсткі генацыд. Дзеці здзейснілі віртуальную экскурсію па мемарыяльным комплексе "Хатынь". У памяць аб загінуўшых жыхарах спаленых беларускіх вёсак вучні вывесілі на дошку папяровыя званочкі, на якіх яны напісалі пажаданні ўсім, хто жыве. Важным этапам урока стала правядзенне хвіліны маўчання з выкарыстаннем гуку метранома. Падчас мерапрыемства вучні прыйшлі да вываду, што неабходна берагчы мір і спакой на роднай зямлі, памятаючы пра трагічнае мінулае і не робячы памылак у сучаснасці.





Пачаткам урока ў 7-9 класах стала разважанне вучняў аб тым, што такое памяць. У час правядзення мерапрыемства ішла размова аб падзеях у Хатыні як прыкладзе палітыкі генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Здзейснена відэаэкскурсія ў Хатынь. Акцэнтавана ўвага навучэнцаў на тое, як памяць аб вайне захавана ў кнігах, фільмах. Удзельнікі мерапрыемства праглядзелі буктрэйлер "Я з вогненнай вёскі". Цікавым момантам стала рэалізацыя міні-праекта "Палалі вёскі Дзяржыншчыны". Ушанавалі памяць аб забітых хвілінай маўчання.







# Адзіная інфармацыйная гадзіна



З мэтай фарміравання ў вучняў уяўлення аб міры як шматзначным паняцці, раскрыцця значнасці захавання і ўмацавання міру як вышэйшай каштоўнасці, фарміравання ўяўлення аб міралюбівай палітыцы Рэспублікі Беларусь 24 сакавіка ў школе прайшла адзіная інфармацыйная гадзіна "Беларусь - краіна міру, сяброўства і добрасуседства".

Падчас інфармацыйнай гадзіны вучні прыйшлі да высновы, што мір – гэта стан спакою і стабільнасці. Калі ў краіне існуе мір, ёсць парадак, гармонія і цярпімасць, яго людзі адчуваюць сябе ў бяспецы. Неабходна памятаць, што мірнае неба над галавой - самае каштоўнае, што можа мець чалавецтва. Толькі ў мірны час мы можам атрымліваць добрую адукацыю, не адчуваць ні ў чым патрэбы, жыць дружнай сям'ёй, радавацца кожнаму новаму дню і атрымліваць асалоду ад прыгажосці прыроды.






# Агульнашкольны бацькоўскі сход

25 сакавіка адбыўся агульнашкольны бацькоўскі сход "Узаемадзеянне сям'і і школы па пытаннях прафілактыкі правапарушэнняў і бездагляднасці".

Перад бацькамі выступіла Рэбека Ю.У., участковы інспектар ІСН Дзяржынскага РАУС. Юлія Вітальеўна звярнула ўвагу прысутных на тое, што ў раёне павялічылася колькасць крадзяжоў, пачасціліся выпадкі пашкоджвання маёмасці грамадзян і дзяржаўных арганізацый, агучыла праблему злоўжывання электроннымі цыгарэтамі сярод непаўналетніх, нагадала бацькам аб адказнасці за жыццё і выхаванне дзяцей.






# Здаровы Я – здаровая малая радзіма мая!

ЗДОРОВЫЙ ОБРАЗ ЖИЗНИ

На працягу сакавіка ў рамках месячніка "Здаровы Я - здаровая малая радзіма мая!" у школе прайшлі шматлікія мерапрыемствы, накіраваныя на фарміраванне ў вучняў перакананасці і неабходнасці вядзення здаровага ладу жыцця, выпрацоўку негатыўнага стаўлення да шкодных звычак.

Класная і інфармацыйная гадзіны "Небяспечныя рэчы дома", "Лекі на талерцы" (1 клас); віктарына “Хто, калі не мы” (4 клас).






У рамках адукацыйнага праекта "Школа Актыўнага Грамадзяніна" вучні 5-6 класаў стварылі калаж "Зямля - наш агульны дом". У 8-9 класах адбыўся круглы стол “Здароўе чалавека XXI стагоддзя”.






Прайшлі шматлікія спартыўныя мерапрыемствы: спаборніцтвы “Стралок месяца”, “Чорныя і белыя”, спаботніцтва па бадмінтону і інш.





Адбылася сустрэча з фельдшарам ФАПа Кужоўнік Т.В. па пытаннях прафілактыкі шкодных звычак.




Рэдкалегія: вучні 5 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 5 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 30 красавіка.